# УРОК-ЭКСКУРСІЯ Ў ТРЫ ВЫСТАВАЧНЫЯ ЗАЛЫ ЖЫВАПІСУ І.Я. РЭПІНА Ў 9-М КЛАСЕ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ НА ТЭМУ “ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА ПА РАЗДЗЕЛЕ «БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ: БУДОВА, ЗНАЧЭННЕ, УЖЫВАННЕ»”



**Запрудская Валянціна Іосіфаўна,**
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі ДУА “Сасноўская дзіцячы сад-базавая школа Віцебскага раёна”*

Праводзіцца ў 3-й чвэрці (люты)

Урок беларускай мовы ў 9-м класе.

Мэта: Падагульніць і сістэматызаваць веды вучняў пра бяззлучнікавыя складаныя сказы, іх пунктуацыйнае афармленне.

Удасканальваць уменні вызначаць межы прэдыкатыўных частак, сродкі сувязі і сэнсавыя адносіны паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

Развіваць вусную мову, уменне выступаць перад аўдыторыяй.

Выхоўваць цікавасць да сваёй культурнай спадчыны, да гісторыі роднага краю.

Абсталяванне: мультымедыйная ўстаноўка; партрэт І.Я. Рэпіна, здымак музея ў Здраўнёве; партрэты М.П. Мусаргскага, П.А. Стрэпетавай, П.М. Траццякова; карціны І.Я. Рэпіна “Бурлакі на Волзе”, “Іван Грозны і яго сын Іван”, “Л.М. Талстой на раллі”, “Асенні букет”, “Месячная ноч”, “Беларус”.

Ход урока

На экране партрэт мастака І.Я. Рэпіна і здымак музея ў Здраўнёве.

Уступнае слова настаўніка:

– Імя мастака Ільі Яфімавіча Рэпіна вядома кожнаму чалавеку. Яго жыццё было цесна звязана з нашай Віцебшчынай, з хутарам Здраўнёва, дзе мастак пражыў восем гадоў. З беларускай зямлёй звязана адна са старонак яго творчасці. Тут ён знаходзіў натхненне, сюжэты і прататыпы для сваіх карцін, адчуваў радасць ад сустрэч з сялянамі. Тут Рэпін мог знайсці магчымасць адпачыць пасля шумнага горада. Цвіценне бэзу вясной, спевы птушак, ціхі шэпт хваль Заходняй Дзвіны – усё гэта стварала ўмовы для працы і давала пачуццё шчасця і ўнутранага спакою. Ілья Яфімавіч даўно марыў купіць дзе-небудзь хутар на беразе ракі, каб вясной ці летам адпачываць усёй сям’ёй на ўлонні прыроды. Аднойчы ён напісаў сваёй знаёмай мастачцы А.М. Звонцавай: “Усё больш думаю пакінуць Пецярбург, каб пасяліцца на хутары і жыць з прыродай. Ах, прырода! Якая яна цудоўная! Як я люблю восень, калі ападаюць лісты, цішыню ў лесе, свежы пах апалай лістоты…”. Праз некаторы час І.Я. Рэпін даведаўся ад свайго сябра С.А. Берса пра тое, што каля Віцебска прадаецца хутар. Праз два тыдні ён стаў гаспадаром маёнтка ў Здраўнёве.

Репозиторий ВГУ

Ілья Яфімавіч так пісаў мастаку В.А. Сярову: "Вось і ажыццявіў сваю мару: купіў цудоўны хутар. Край цёплы, народ разнастайны. Цяпер так і цягне туды…".

Сённяшні ўрок у нас будзе праходзіць у форме экскурсіі ў тры выставачныя залы жывапісу І.Я. Рэпіна. Мы даведаемся пра асобу мастака, пра людзей, якіх ён намаляваў на сваіх палотнах. А таксама паўторым пастаноўку знакаў прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах.

Давайце ўспомнім, якія знакі прыпынку ставяцца на пісьме паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах. (Адказы вучняў: коска, коска з кропкай, двукоссе і працяжнік.)

**А зараз адпраўляемся ў першую залу, якая называецца "Партрэты знакамітых людзей".**

**(На экране змешчаны партрэты кампазітара М.П. Мусаргскага, актрысы П.А. Стрэпетавай, мецэната-калекцыянера П.М. Траццякова.)**

Да дошкі выходзіць вучань, які падрыхтаваў паведамленне пра кампазітара М.П. Мусаргскага:

– Партрэт Мадэста Пятровіча Мусаргскага займае асобае месца сярод работ І.Я. Рэпіна. Як вядома, мастак напісаў яго за некалькі дзён да смерці кампазітара, што надае палатну асаблівы драматызм. Аўтар засяроджвае нашу ўвагу на твары кампазітара, нібы спрабуе перадаць сакрэт генія Мусаргскага. У яго вачах мы бачым смутак. Але гэта вочы энергічнага і моцнага чалавека. І.Я. Рэпін здолеў перадаць фізічны і духоўны стан кампазітара. Крытык Уладзімір Стасаў высока ацаніў работу мастака: "Гэта неверагодна! Падумаць толькі, напісана ўсяго за чатыры сеансы! Усе, хто ведаў Мусаргскага, згадзіліся, што Рэпін змог перадаць усю натуру, увесь знешні воблік кампазітара".

Вучань піша пад дыктоўку настаўніка сказ і тлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў ім:

**Інтарэсы Мусаргскага адной музыкай не абмяжоўваліся: ён захапляўся філасофіяй, гісторыяй, літаратурай.**

Да дошкі выходзіць другі вучань і расказвае пра актрысу Пелагею Анціпаўну Стрэпетаву:

– Сустракаюцца лёсы людзей, якія здзіўляюць сваёй незвычайнасцю і ўнутранай завершанасцю. Такім было жыццё Пелагеі Анціпаўны Стрэпетавай. У сем гадоў яна выйшла першы раз на сцэну тэатра, а ў пятнаццаць ужо стала прафесійнай актрысай. Праз некаторы час чуткі пра яе бліскучую ігру сталі распаўсюджвацца па ўсёй Расіі. Першыя яе выступленні здзівілі і зацікавілі публіку. І гэта не выпадкова, бо Стрэпетава была таленавітай актрысай.

Вучань запісвае сказ і тлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў ім:

**Актрыса Стрэпетава ўнесла вялікі ўклад у мастацтва: яна аднавіла прынцыпы тэатральнай ігры, стварыла незабыўныя сцэнічныя вобразы, напоўніла іх жывым пачуццём.**

Да дошкі выходзіць трэці вучань і расказвае пра Паўла Міхайлавіча Траццякова:

– Павел Міхайлавіч Траццякоў – рускі прадпрымальнік, мецэнат, калекцыянер, збіральнік твораў рускага выяўленчага мастацтва. Гэты занятак стаў мэтай яго жыцця, каб "нажытае ад грамадства вярнулася назад таму ж грамадству (народу)". Ён з'яўляецца заснавальнікам Траццякоўскай галерэі, дзе нацыянальны жывапіс можна ўбачыць як адно цэлае. Траццякоў падтрымліваў найбольш таленавітых і яркіх мастакоў, тым самым дапамагаў росквіту і фарміраванню мастацкай культуры Расіі другой паловы XIX стагоддзя.

Павел Міхайлавіч паходзіў з купецкай сям'і, валодаў мануфактурнай фабрыкай, а гэта давала яму сродкі для справы ўсяго яго жыцця – збіральніцтва калекцыі карцін. Яго жыццё – сапраўдны подзвіг, а сам ён заслугоўвае ўдзячнасці, памяці і павагі як нацыянальны герой.

Вучань запісвае сказ і таксама тлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку:

**Сучаснікі ведалі Траццякова як сардэчнага, добрага чалавека: ён матэрыяльна падтрымліваў таленавітых мастакоў, дапамагаў вучылішчу глуханямых, быў арганізатарам прытулку для ўдоў і сірот.**

***Далей адпраўляемся на экскурсію ў другую залу жывапісу І.Я. Рэпіна, якая называецца "Шэдэўры знакамітага мастака".***

***(На экране змешчаны карціны І.Я. Рэпіна "Бурлакі на Волзе", "Іван Грозны і яго сын", "Л.М. Талстой на раллі".)***

Да дошкі выходзіць першы вучань і расказвае пра гісторыю стварэння палатна "Бурлакі на Волзе":

– Упершыню І.Я. Рэпін убачыў бурлакоў на Няве летам 1868 года. Аднойчы раніцай ён адправіўся на прагулку на параходзе. Раптам заўважыў "карычневую пляму", якая рухалася і цягнула за сабой баржу. Гэта былі бурлакі. Мастак заўважыў панурыя твары, брудную вопратку, мускулістыя рукі. Ілья Яфімавіч паставіў перад сабой мэту: адлюстраваць бурлакоў на карціне. Усё лета 1870 года І.Я. Рэпін правёў на Волзе, дзе рабіў замалёўкі пейзажаў, назіраў за бурлакамі, вывучаў іх характары. Так з'явіўся вядомы ўсім твор "Бурлакі на Волзе".

Вучань запісвае сказ і тлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку:

**Шырока раскінуліся прасторы Волгі, роўнай лініяй цягнецца гарызонт, вецер гоніць хвалі да берага, стомленыя людзі цягнуць за сабой баржу – усё гэта мы бачым на карціне Рэпіна "Бурлакі на Волзе".**



Репозиторий ВГУ

Наступны вучань расказвае пра работу “Іван Грозны і яго сын”:

– Напісанне карціны “Іван Грозны і яго сын” забрала шмат сіл у Рэпіна. Ён хадзіў па вуліцах, шукаў вобразы, рабіў замалёўкі. Твор выклікаў вялікую цікавасць у грамадстве. У Траццякоўскую галерэю ішлі глядзець толькі яе. У зале, дзе яна была выстаўлена, паклалі чырвоны дыван, які нібы прадаўжаў малюнак і прыводзіў наведвальнікаў у пакой, дзе адбылося забойства. Лёс карціны склаўся трагічна. 16 студзеня 1913 года малады іканапісец Абрам Балашоў прыйшоў у галерэю і тры разы ўдарыў нажом па карціне. Рэстаўрацыя палатна была праведзена паспяхова, але арыгінальнае рэпінскае пісьмо было страчана.

Трэці вучань запісвае сказ і тлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў ім:

**Кроў струменіцца са смяротнай раны царскага сына, бурлакі ідуць берагам Волгі, сын вярнуўся з турмы – усё гэта фрагменты вядомых карцін І.Я. Рэпіна.**

Трэці вучань расказвае пра карціну “Л.М. Талстой на раллі”:

– Карціна “Л.М. Талстой на раллі”, як успамінае сам мастак, з’явілася ў той дзень, калі Леў Мікалаевіч араў поле адной удавы. Рэпін у гэты дзень якраз знаходзіўся ў Яснай Паляне. Талстой працаваў без адпачынку шэсць гадзін. Мастак з альбомам у руках фіксаваў усе яго рухі.

Вучань запісвае сказ і тлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку:

**Талстой нагадвае нам загарэлых бурлакоў: мы бачым тую ж сілу, адданасць сваёй справе, той жа нацыянальны тып і склад.**

***Трэцяя зала прысвечана карцінам, якія І.Я. Рэпін напісаў у Здраўнёве. Яна так і называецца “Здраўнёўскі перыяд творчасці І.Я. Рэпіна”.***

***(На экране карціны “Беларус”, “Месячная ноч”, “Асенні букет”.)***

Вучань расказвае гісторыю напісання карціны “Беларус”:

– Аднойчы І.Я. Рэпіна зацікавіў лёс мясцовага хлопца з вёскі Сахарава, які ў дзяцінстве аслеп, а потым праз 10 год зрок да яго вярнуўся без усякага лячэння. Пасля знаёмства з Сідарам Шаўровым, мастак вырашыў напісаць яго партрэт. Праца доўжылася 3 дні. Летні дзень. На фоне зеляніны, абапёршыся на агароджу, стаіць малады мужчына. У яго адкрытым поглядзе адчуваюцца ўпэўненасць у сабе, чалавечая годнасць, прыгожая сіла і здароўе. На думку мастацтвазнаўца У.Н. Масквіна, гэты партрэт па праву стаіць у ліку лепшых сялянскіх вобразаў рускага жывапісу.

Вучань запісвае сказ і тлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў ім:

**Селянін у ружовай кашулі і светлай світцы стаіць, прыхіліўшыся да агароджы; яго жывы і смелы погляд адкрыты нам, гледачам; мастак стварыў прывабны вобраз маладога прыгожага чалавека, упэўненага ў сваёй спакойнай і добрай сіле.**

Наступны вучань расказвае пра карціну “Месячная ноч”:

– На гэтым палатне мастак адлюстраваў сваю сярэднюю дачку Надзею. І.Я. Рэпін любіў гуляць ля Дзвіны, заходзіць у навакольныя вёскі, дзе знаходзіў тэмы для сваёй творчасці. Яго заўсёды вабіла прырода, на ўлонні якой ён любіў маляваць. На карціне мы бачым ціхую гладзь начной ракі. У вадзе адлюстроўваецца серабрыстае святло месяца. Сёння гэты твор знаходзіцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі.

Вучань запісвае сказ і тлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў ім:

**Ля самай вады, любуючыся малюнкамі прыроды, стаіць дзяўчына, ля яе ног ляжыць сабака; вакол ціха і пустынна; нішто не парушае спакой ночы да раніцы; толькі святло месяца нібы бяжыць па хвалях.**

Вучань расказвае пра карціну “Асенні букет”:

– На гэтым палатне мы бачым старэйшую дачку мастака Веру. І.Я. Рэпін любіў пісаць з натуры, каб перадаць не толькі выгляд, але і ўнутраны стан чалавека. Карціна “Асенні букет” уся напоўнена паветрам, яна перадае пачуццё маладосці, замілаванне прыродай. Палатно для сваёй галерэі набыў калекцыянер-мецэнат П.М. Траццякоў. Яно і сёння ўпрыгожвае вядомы музей.

Вучань піша сказ і тлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку

**На фоне саду стаіць маладая дзяўчына з вялікім букетам палявых кветак, яе фігура нібы знаходзіцца ў рассеяным святле, радуе вока святочнае спалучэнне колераў і паветра – усё гэта мы бачым на карціне І.Я. Рэпіна “Асенні букет”.**

**Слова настаўніка:**

– Вось і закончылася наша экскурсія ў тры выставачныя залы жывапісу І.Я. Рэпіна, жыццё якога было цесна звязана з нашай Віцебшчынай. Тут ён стварыў каля сарака карцін. Дотык да таямніцы і загадкі – гэта заўсёды дзіва. І добра, што гэтае дзіва нельга разгадаць, а таму да яго хочацца вяртацца зноў і зноў.

Рэфлексія.

– Дома вам трэба было прачытаць кнігу ўспамінаў І.Я. Рэпіна “Далёкае блізкае”.

Я прапаную вам разгадаць крыжаванку па творчасці мастака, а кніга дапаможа вам у гэтым.

Репозиторий ВГУ

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | **З** | Д | Р | А | Ў | Н | Ё | В | А | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | **Д** | У | Э | Л | Ь | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | Б | У | **Р** | Л | А | К | І | | Н | А | | В | О | Л | З | Е | | | |
| | | | | | | | Б | Е | Л | **А** | Р | У | С | | | | | | | | | | | | | |
| Х | Р | Э | С | Н | Ы | | Х | О | Д | **У** | | К | У | Р | С | К | А | Й | | Г | У | Б | Е | Р | Н | І |
| | | | | | | | А | С | Е | **Н** | Н | І | | Б | У | К | Е | Т | | | | | | | | |
| | | | | | | | Д | А | Л | **Ё** | К | А | Е | | Б | Л | І | З | К | А | Е | | | | | |
| | | | | | | | | | І | **В** | А | Н | | Г | Р | О | З | Н | Ы | | | | | | | |
| | | | | | | | | | Т | **А** | Л | С | Т | О | Й | | Н | А | | Р | А | Л | Л | І | | |

1. Вёска на Віцебшчыне, дзе жыў і працаваў І.Я. Рэпін.

2. Гэты твор Рэпіна меў вялікі поспех у Венецыі, але на Радзіме мастака прызнання не атрымаў.

3. Гэта самая вядомая карціна мастака. На ёй адзінаццаць мужчын цягнуць за сабой баржу.

4. Пазіраваў І.Я. Рэпіну пры напісанні работы малады чалавек Сідар Шаўроў.

5. Карціна на рэлігійную тэматыку.

6. Палатно, на якім мастак адлюстраваў сваю старэйшую дачку Веру.

7. Кніга ўспамінаў І.Я. Рэпіна.

8. Карціна на гістарычную тэму.

9. Твор, на якім І.Я. Рэпін адлюстраваў вялікага рускага пісьменніка ў час працы на полі.

Настаўнік:

– Якое слова атрымалася ў нас па вертыкалі? (Здраўнёва).

Калі вы яшчэ не наведалі музей І.Я. Рэпіна ў Здраўнёве, то я раю абавязкова зрабіць гэта, каб дакрануцца да крыніцы думак і пачуццяў, дзе знаходзіў вытокі сваёй бессмяротнай творчасці вялікі мастак Ільля Яфімавіч Рэпін.

**ПОДГОТОВИТЕЛЬНОЕ ОТДЕЛЕНИЕ**
**ВИТЕБСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМЕНИ П.М. МАШЕРОВА**

осуществляет набор на

**ЭКСПРЕСС-КУРСЫ ПО ПОДГОТОВКЕ К ЦТ**

Период обучения – апрель–май.
Учебным планом предусмотрено 42 часа по каждому предмету.

ЗАПИСЬ НА КУРСЫ ОСУЩЕСТВЛЯЕТСЯ С 1 МАРТА.

**ЭКСПРЕСС-КУРСЫ ПО ПОДГОТОВКЕ К ЭКЗАМЕНАМ:**
**• творчество (рисунок, композиция);**
**• русская (белорусская) литература.**

Период обучения – июнь–июль.
Учебным планом предусмотрено 36–42 часа по каждому предмету.

Иногородним слушателям предоставляется общежитие.

ЗАПИСЬ НА КУРСЫ ОСУЩЕСТВЛЯЕТСЯ С 1 ИЮНЯ.

Наш адрес: г. Витебск, Московский пр-т, 33, каб. 122а, 122.
Телефоны подготовительного отделения: 8 (0212) 27 03 96; 8 (0212) 58 96 49; +375 33 317 95 09.
Сайт университета: vsu.by.
Группа «АБИТУРИЕНТ ВГУ» в социальной сети «ВКОНТАКТЕ»: vk.com/abiturvsu.

Репозиторий ВГУ